# РАЗДЕЛ VI

# ЛІНГВАСТЫЛІСТЫКА І ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ

**Вольга Бардзіян**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## СІНТАКСІЧНАЯ РОЛЯ НАМІНАТЫВА Ў ТВОРАХ ЯНКІ БРЫЛЯ

Тэрмін намінацыя (ад лац. nominatio – найменне) абазначае працэс стварэння моўных адзінак, з дапамогай якіх вылучаюцца паняцці, адбываецца атаясамліванне, пазнанне і размежаванне з'яў рэчаіснасці.

У функцыянальна-генетычным аспекце вылучаюцца першасная, або прамая (успрымаецца як невытворная), і другасная намінацыя, пад якой разумеюцца любыя вытворныя найменні, што ўзнікаюць на розных узроўнях моўнай сістэмы на базе наяўных у мове сродкаў.

Калі акцэнтаваць увагу на камунікатыўным аспекце мовы, што характэрна для сучаснай лінгвістыкі, то неабходна разглядаць моўныя адзінкі, якія суадносяцца з пэўным прадметам або пэўнай сітуацыяй. У семантычным сінтаксісе ў якасці такіх намінатыўных адзінак выступаюць сказы, якія вызначаюцца як падзейныя (сітуацыйныя) намінацыі: «Чалавечае разуменне. Чалавечы давер. Адчуванне рукі» [1, с. 94]. Галоўны член у такіх сказах часцей за ўсё прадстаўлены назоўнікам у форме назоўнага склону (лац. nominatius) ці, як назіраем у прыведзеных сказах, назоўнікам з залежным кампанентам.

Значэнне прэдыкатыўнасці ў такіх сінтаксічных канструкцыях выражаецца канстатацыяй фактаў, інтанацыйным адценнем: «Сход у раёне. Кампанія па барацьбе з "тунеядцамі"» [Тамсама, с. 332]. Прыведзеныя намінатыўныя аднасастаўныя сказы сваімі стылістычнымі магчымасцямі здольныя перадаваць найтанчэйшыя сэнсавыя нюансы, адценні думак. Менавіта такія сінтаксічныя канструкцыі, у якіх ярка выражаны намінатыў,





характэрны для прозы Янкі Брыля. Яны, як правіла, вельмі лаканічныя, кароткія, звычайна апісваюць карціну, даючы тым самым свабоду чытачу ў яе дамалёўцы.

Пазіцыю галоўнага члена могуць займаць лічэбнікі або колькасна-іменныя спалучэнні, якія маюць рэальную мадальнасць і значэнне цяперашняга часу: «Ліпень сорак чацвёртага года. Нарада раённага савецка-партыйнага актыву з партызанаў, забраніраваных ад фронту» [1, с. 240]; «Лістапад восемдзесят трэцяга. Польшча» [2, с. 303]. Пэўная адцягненасць і ў той жа час вобразнасць, маляўнічасць – спецыфічныя функцыянальна-стылістычныя асаблівасці намінатыўных сказаў, што дазваляе празаіку вызначыць тое індывідуальнае, а разам з тым і творчае пры апісанні героя ці падзеі.

У арганізацыі намінатыўных сказаў вялікая роля належыць семантыцы наймення з'явы, прадмета размовы, што выражаецца пэўнай лексемай, здольнай перадаваць значэнне быццёвасці, стану: «Уваход у пачатак жыцця, у першую гарадскую палавіну маленства» [1, с. 20]. У прыведзеным кантэксце аўтар спалучае сінтаксічны спосаб лаканізацыі тэксту з удалым падборам лексічных адзінак, якія не толькі дакладна, але і вобразна раскрываюць сітуацыю. Такія сказы вызначаюцца ў лінгвістыцы як быццёвыя апісальныя.

Сцісласць, спарадкаванасць тэкстаў дасцягаецца Янкам Брылём праз выкарыстанне сінтаксічных канструкцый, у якіх функцыю намінатыва дапамагаюць выконваць і выконваюць указальныя часціцы або ўказальныя займеннікі: «А вось і яшчэ падобнае» [Тамсама, с. 305]; «А ўсё гэта жыццё, жыццё…» [Тамсама, с. 32]; «І такая яшчэ акалічнасць» [Тамсама, с. 332].

Намінатывы, выражаныя з дапамогай эмацыйна-экспрэсіўных часціц, дазваляюць аўтару даследаваць, апісваць рэчаіснасць у святле суперажывання, даючы ўласную маральна-эстэтычную ацэнку падзеі: «– Ого, ты яшчэ арол! – Ну, браце, арол… Маім крылом баба ўжо прыпек вымятае» [2, с. 293]. Такія сказы не толькі канстатуюць пэўную існасць, але і раскрываюць эмацыйна-псіхалагічны стан героя.

Справядліва будзе лічыць, што менавіта намінатыўныя сказы ў тэкстах Янкі Брыля з'яўляюцца асноўнай формай пе-

радачы людскіх радасцяў, клопатаў і трывог: «Цяжкасці, перашкоды… Усё такое ды падобнае трэба было пераносіць чуламу сэрцу, вострай сумленнасці, абражанай годнасці чалавека і мастака» [3, с. 429].

Намінатыў дазваляе аўтару не толькі выдзеліць самае істотнае, важнае, расказваючы пра людзей, з якімі ён сустракаўся ў рэальным жыцці, але і дапоўніць іх вобразы мастацкай выдумкай: «Леташні ліпень… Валодзя паехаў зноў на Палессе, у апошняе, скажам цяпер, у адчайнае падарожжа…» [Тамсама, с. 426]. Пры такой эмацыйнай падачы матэрыялу думка аўтара разглядаецца эмфатычнай паўзай. Самастойная інтанацыя, сэнсавая незавершанасць першага сказа мае сваёй мэтай выклікаць адпаведныя разважанні, глыбей асэнсаваць ролю названай з'явы ці сітуацыі ў наступных сінтаксічных адзінках. Такія асаблівыя стылістычныя фігуры з ідэальным намінатывам уяўляюць сабой так званыя канструкцыі з «назоўным уяўлення», якія ў пэўнай меры таксама абазначаюць найменне, бо любы назоўнік у назоўным склоне можа выступаць у якасці тэмы: «Індура, Лунна… Прыгожыя назвы вёсак непадалёку ад Гродна. Упершыню пачуў іх у раннім юнацтве…» [1, с. 331]; «Свет літаратуры… Для Алеся гэта Пушкін, Лермантаў, Гогаль, Горкі – з усёй абветранай і сонечнай абаяльнасцю сваіх "басяцкіх" апавяданняў…» [3, с. 12].

Сінтаксічныя элементныя намінацыі непасрэдна суадносяцца з пэўнымі падзеямі, сітуацыямі і выступаюць у мастацкім тэксце ў форме розных відаў сказа. У стылістычна-мастацкай сістэме Янкі Брыля такія канструкцыі актуалізуюць камунікатыўнасць і паўнату паведамлення. Трэба таксама сказаць, што намінатыву належыць вялікая роля ў лаканізацыі тэксту. Намінатыўныя сказы ў мастацкіх тэкстах празаіка выконваюць кампазіцыйную функцыю, даюць эмацыйную, маральна-этычную ацэнку фактам ці падзеям, якія апісваюцца.

*Літаратура*

1. Брыль, Я. Пішу як жыву: аповесць, апавяданні, мініяцюры, эсэ / Янка Брыль. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 363 с.
2. Брыль, Я. Вячэрняе: лірычныя запісы і мініяцюры / Янка Брыль. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 350 с.

3. Брыль, Я. Запаветнае: выбраныя творы / Янка Брыль; прадм. С. Андраюка, камент. Н. Семашкевіч. – Мінск: Беллітфонд, 1999. – 448 с.